УДК 574.03:1

А.С.Чэрвінскі, дац., вяд. навук. супр., канд. філас. навук
(Інстытут філасофіі НАН Беларусі, г. Мінск)

# САЦЫЯ-ПРЫРОДНАЕ АДЧУЖЭННЕ Ў ПОСТАВАРЫЙНАЙ БЕЛАРУСІ ЯК АБ’ЕКТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Адчужэнне чалавека ад навакольнага яго прыроднага асяроддзя ў пост-Чарнобыльскі перыяд атрымала шырокае распаўсюджванне сярод жыхароў Беларусі. Дэградацiя якасці прыроднага асяроддзя справакавала рэзкую змену сацыяльна-экалагічных арыентацый і істотную пераацэнку традыцыйных стэрэатыпаў сацыяльнага прырода-карыстання.

Сярод найбольш актуальных праблем – узнікненне сіндрому сацыяльна-прыроднага адчужэння, справакаванага ўсведамленнем радыяцыйнай небяспекі, якая вынікае з прыроды, што акружае чалавека, разуменнем экалагічнай экстрэмальнасці ўмоў жыцця і чаканнем далейшага пагаршэння якасці пражывання. У яго аснове ляжыць выкліканы катастрофай страх чалавека перад прыродай і жаданне пазбегнуць непасрэднага кантакту з кампанентамі біясферы, у адносінах да якіх няма ўпэўненасці ў экалагічнай бяспецы. Разам з тым, адчужэнне нельга трактаваць як з'яву неадэкватнай рэакцыі чалавека на змены навакольнага асяроддзя, бо яно істотна выходзіць за рамкі гэтай з'явы[1, с.112].

Асноўныя прычыны, якія прывялі да адчужэння, у агульным плане можна прадставіць так: а) адабранне тэрыторый з месцамі традыцыйнага індывідуальнага прыродакарыстання: забруджанымі ягаднікамі, месцамі збору дзікарослых траў, прысядзібнымі участкамі і інш.; б) забароны, якія ў адміністрацыйным парадку накладаюцца на некаторыя формы сацыяльнага прыродакарыстання: гаспадарчае выкарыстанне драўніны, торфу, выпас жывёлы ў лесе і інш.; в) асабістыя абмежаванні кантактаў з прыродным асяроддзем, заснаваныя на медыка-біялагічных рэкамендацыях і ацэнках экалагічнай сітуацыі; г) негатыўная ацэнка стану ўласнага здароўя і здароўя блізкіх, асабліва дзяцей; д) сацыяльна-псіхалагічны фактар: стан трывогі, неўсвядомленага страха перад навакольным асяроддзем, прынечнасці, выкліканы самім фактам пражывання на забруджанай тэрыторыі.

Да суб’ектыўных перадумоў узнікнення адчужэння належыць перш за ўсё тая акалічнасць, што фарміраванне экалагічнага імператыву ў адрозненне ад традыцыйных варыянтаў у экстрэмальных умовах ажыццяўляецца без неабходных навукова-інфармацыйных перадумоў. Таму тут фарміруецца насцярожанае стаўленне да разнастайных навуковых рэкамендацый па аптымізацыі сацыя-

прыродных узаемаадносін на экстрэмальных тэрыторыях і рэзка негатыўнае стаўленне да любой экалагічна пазітыўнай ацэнкі сітуацыі. Па сутнасці, у дадзеным выпадку ахвотна прымаюцца толькі экалагічна негатыўныя ацэнкі, прычым практычна без уліку крыніцы: ці гэта сур'ёзнае навуковае даследаванне, ці чарговая псеўданавуковая сенсацыя газетнага ўзроўню[2, с.197].

Да ўскосных фактараў, якія спрыяць адчужэнню варта аднесці дэградацыю сацыяльных структур ў экалагічных экстрэмальных умовах: пагаршэнне бытавога забеспячэння, умоў працы, аховы здароўя і г.д. У гэтым выпадку можна казаць аб узнікненні своеасаблвіых комплексных працэсаў у выніку накладання і цеснага ўзаемнага перапляцення экалагічных і сацыяльных фактараў, якія ўздзейнічаюць на чалавека ў экстрэмальных экалагічных умовах. Прынцыповае адрозненне пост-Чарнобыльскага адчужэння ад падобных з'яў, выкліканых лакальнымі праявамі дэградацыі якасці навакольнага асяроддзя ў выглядзе кіслотных дажджоў, забруджвання вадаёмаў нафтай, утварэння смогу і г.д., заключаецца ў татальным характары адчужэння чалавека ад прыроднага асяроддзя, фарміраванні глабальнай сацыя-прыроднай сітуацыі, калі ўсё навакольнае асяроддзе, ва ўсіх формах яго праяўлення, прадстане як крыніца сур'ёзнай экалагічнай небяспекі. Чарнобыльскае адчужэнне набывае масавыя формы пры спалучэнні суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў і развіваецца на фоне рэзкага пагаршэння як прыродных, так і сацыяльных умоў жыцця людзей.

Складанасць навуковай інтэрпрэтацыі пост-Чарнобыльскай сітуацыі абумоўлена не толькі адсутнасцю прыродазнаўчых распрацовак, якія б маглі растлумачыць, як узнікае ланцужок медыка-біялагічных анамалій і, такім чынам, стварыць пэўную тэарэтычную базу для распрацоўкі навуковых рэкамендацый па нармалізацыі сацыяльна-экалагічнай абстаноўкі ў рэгіёнах, якія пацярпелі ад радыеёктыўнага забруджвання, колькі ад таго, што вырашэнне праблемы якасці пражывання насельніцтва, якое пражывае на забруджаных тэрыторыях, у вызначальнай меры залежыць ад таго, наколькі забяспечаны працэсы рэабілітацыі забруджаных тэрыторый.

У перспектыўным плане праблема пераадолення адчужэння звязана з даследаваннем феномена экалагічнай свядомасці, які ўяўляе сабой адну з найбольш актуальных і адначасова найменш даследаваных праблем у тэорыі сацыяльнага прыродакарыстання. Шэраг спецыфічных момантаў прынцыпова адрознівае працэс станаўлення экалагічных аспектаў у індывідуальнай свядомасці на экстрэмальных тэрыторыях. Перш за ўсё, гэта выбухны, "рэвалюцыйны" характар

узнікнення моманту экалагічнай арыентацыі ў грамадскай свядомасці ў такіх рэгіёнах, якія, у адрозненне ад “эвалюцыйных”, паступовых формаў усведамлення генетычнай блізкасці чалавека і прыроднага асяроддзя, практычна ажыццяўляецца без неабходнага інфармацыйна-культурнга базісу. Варта адзначыць прамы, непасрэдны характар адлюстравання неспрыяльнага экалагічнага феномена ў індывідуальнай свядомасці, абмінаючы найважнейшую з форм грамадскай свядомасці - навуку. Шлях фарміравання экалагічных ведаў значна карацейшы за традыцыйны. Калі адчужэнне разглядаць як форму індывідуальнай рэакцыі на дэградацыю якасці асяроддзя, то ў залежнасці ад таго, якой будзе агульная ацэнка экалагічнай сітуацыі, можна будзе выбраць шлях з экалагічна крызіснай сітуацыі. Рэабілітацыйную дзейнасць нельга лічыць беспрадметнай і ў пэўнай ступені бессістэмнай, ігнаруючы факт прычынна-выніковай сувязі паміж узроўнем экалагічнай кампетэнтнасці і характарам сацыяльных адносін. Актыўнасць суб'екта і накіраванасць яго дзеянняў вызначаюцца як аб'ектыўнымі фактарамі, так і суб'ектыўнай, індывідуальнай рэакцыяй на існуючую экалагічна экстрэмальную сітуацыю[3, с.19].

Праблема сацыяльнага адчужэння ў сітуацыі рэзкай дэградацыі якасці навакольнага асяроддзя сведчыць аб тым, што сама дынаміка сацыяльнага развіцця з неабходнасцю адкрывае новыя сферы прымянення канцэптуальнага апарату сацыяльнай экалогіі як у традыцыйных формах чалавечай жыццядзейнасці, так і ў прынцыпова новых. якія яшчэ не маюць шырокага распаўсюджвання і, такім чынам, дастаткова адэкватнага навуковага апісання сфер сацыя-прыроднага ўзаемадзеяння.

ЛІТАРАТУРА

1. Бортновский В. Н., Зенченко И. О. Картографические методы при оценке населения и состояния окружающей среды радиационно загрязненных территорий. – Гомель: Университетское, 2004. – 203 с.

2. Биология и современное научное познание. – М.: Наука, 2000. – 182 с.

3. Булавик И.М. К вопросу о ведении лесного хозяйства на загрязненной территории. // Чернобыль: Медико-биологические проблемы: Тез. докл респ. науч.-пр. конф. Гомель, 25–26 февраля 2002г. – Мн.: ИНВАЦЕНТР, 2002. – С. 18–20.